Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці

прадстаўляе

віртуальную выставу дакументаў

# «Пятрусь Усцінавіч любіў наш горад»

Да 120-годдзя са дня нараджэння

народнага паэта Беларусі

Пятра Усцінавіча Броўкі



**П.У.Броўка.**

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.3486. Воп.5. Спр.13. Арк.9

# Частка 1.
# Гісторыка-краязнаўчы гурток СШ № 3
# г. Віцебска

**Ліст П.У.Броўкі да ўдзельнікаў гісторыка-краязнаўчага гуртка СШ № 3 г.Віцебска.**

***15 лістапада 1957 г.***

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці.
Ф.2154. Воп.1. Спр.249. Арк.1



1

І5 Лістапада І957г.

Паважаная С. Енісейская!

Атрымаў Ваша пісьмо. На жаль, не маю часу, каб прыехаць да Вас у школу. Шчыра дзякую за Ваша запрашэнне. На гэтых днях вышлю Вам свае кнігі.

Жадаю Вашаму гісторыка-краянаў-чаму гуртку вялікіх поспехаў у рабоце.

З прывітаннем!



Жадаю Вашаму гісторыка-краянаў-чаму гуртку вялікіх поспехаў у рабоце.

З прывітаннем!



***1 рад (злева направа):***
**паэт А.Вялюгін,**
**паэт П.Броўка,**
**жонка Я.Купалы У.Луцэвіч,**
**пісьменнік М.Лынькоў.**

***2 рад (злева направа):***
**удзельнікі гісторыка-краязнаўчага гуртка СШ № 3 г.Віцебска.**

***Не пазней за 1960 г.***

Дзяржаўны архіў
Віцебскай вобласці.
Ф.2424. Воп.2. Спр.271. Арк.1





САЮЗ
ПІСЬМЕННІКАЎ
БЕЛАРУСКАЙ ССР
Мінск, вул. Энгельса, 9
тэл. 2-25-35
2-52-42

★

СОЮЗ
ПИСАТЕЛЕЙ
БЕЛОРУССКОЙ
ССР
Минск, ул. Энгельса, 9
тел. 2-25-35
2-52-42

Бровка

г. Витебск
Средняя школа
членам историко-к
кружка

Минск. Тип. Изд. МВСС и ПО БССР. 62 г. З. 119. Т. 1500.



ПРАЎЛЕННЕ
САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ
БССР

ПРАВЛЕНИЕ
СОЮЗА ПИСАТЕЛЕЙ
БССР

Адрас: Мінск, вул. Энгельса, 9. Тэлефон 2-25-35

[illegible] „26“ УІ 1962 г.

Вучням 3 сярэдняй школы
г. Віцебска

ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

Дзякую Вам за цёплыя словы віншавання ў сувязі з прысуджэннем мне Ленінскай прэміі.

Зараз выслаць Вам зборнік вершаў "А дни идут..." не магу, бо кнігі гэтай у продажу няма. Хутка выйдзе новае выданне і я з прыемнасцю вышлю вам гэты зборнік.

Пятрусь Броўка
ПЯТРУСЬ БРОЎКА,

Старшыня Праўлення Саюза
пісьменнікаў БССР




**Ліст П.У.Броўкі да ўдзельнікаў гісторыка-краязнаўчага гуртка СШ № 3 г.Віцебска.**

***26 чэрвеня 1962 г.***

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці.
Ф.2154. Воп.1. Спр.249. Арк.2, 3



**Фотаздымак П.У.Броўкі з дароўным подпісам гісторыка-краязнаўчаму гуртку СШ № 3 г.Віцебска.**

***2 сакавіка 1965 г.***

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.2154. Воп.1. Спр.249. Арк.4–4адв.



Гісторыка-краязнаўчаму гуртку
3й сярэдняй школы
гр. Віцебска

З пажаданнямі
добрых поспехаў
(Пятрусь Броўка

2. III. 1965 г.

# Частка 2.
# Летні дзень у Віцебску

# ГОСЦІ ВІЦЕБСКА — ДЗЕЯЧЫ КУЛЬТУРЫ

Па запрашэнню гарадскога камітэта партыі ў Віцебску знаходзілася група вядомых пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў — ураджэнцаў нашага горада і вобласці. Гасцямі віцяблян былі народны паэт Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі Пятрусь Броўка, народныя мастакі рэспублікі Заір Азгур, Андрэй Бембель, Яўген Зайцаў, пісьменнікі Генадзь Бураўкін, Уладзімір Караткевіч, Аркадзь Маўзон, Еўдакія Лось, кампазітары Анатоль Багатыроў, Іван Дзяржынскі, Уладзімір Сарокін, Марк Фрадкін.

Госці-землякі пабывалі на заводах заточных станкоў, радыёдэталей, фабрыках «Чырвоны Кастрычнік», «КІМ», «Сцяг індустрыялізацыі» і іншых прамысловых прадпрыемствах Віцебска, сустрэліся з рабочымі, падзяліліся сваімі творчымі планамі. Яны пазнаёміліся са славутымі мясцінамі горада, наведалі мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова, парк «Мазурына», кінатэатр «Беларусь», выступілі па тэлебачанню, зрабілі прагулку па Дзвіне.

Цікавай і змястоўнай была сустрэча дарагіх гасцей у гарадскім камітэце партыі, на якой прысутнічалі прадстаўнікі партыйных, савецкіх, камсамольскіх органаў, творчых арганізацый горада. Сакратары гаркома КПБ В. В. Міхельсон, І. А. Навумчык, Г. Я. Якаўлеў, старшыня гарвыканкома У. А. Багданаў расказалі гасцям аб дасягненнях працоўных Віцебска ў развіцці эканомікі і культуры, аб падрыхтоўцы да 1000-годдзя горада, выкананні велічных планаў пяцігодкі.

Выступіўшыя затым І. Дзяржынскі, М. Фрадкін, У. Караткевіч, У. Сарокін, А. Маўзон і іншыя з захапленнем гаварылі аб тых цудоўных зменах, што адбыліся ў горадзе за пасляваенны час, аб незабыўных сустрэчах з рабочымі і служачымі прамысловых прадпрыемстваў. Яны ўнеслі шмат каштоўных прапаноў па падрыхтоўцы да 1000-годдзя горада.

— Наш ганаровы абавязак, — сказаў, у прыватнасці, кампазітар М. Фрадкін, — стварыць да слаўнага юбілею Віцебска яркія творы, якія б з захапленнем сустрэлі не толькі жыхары горада, але і працоўныя ўсёй нашай краіны. Шматвяковая гісторыя горада, дасягненні віцяблян у камуністычным будаўніцтве даюць мастакам, пісьменнікам, кампазітарам багаты матэрыял. І мы не пашкадуем сіл, энергіі, каб уславіць родны горад у сваіх новых творах.

**На здымках:** госці ўскладаюць кветкі на магілу Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова; выступленне гасцей па тэлебачанню.

Фота М. Шмерлінга.

***1 ліпеня 1972 г.***

*«... **у Віцебску** знаходзілася група вядомых пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў – ураджэнцаў нашага горада і вобласці.*

*Гасцямі віцяблян былі народны паэт Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі **Пятрусь Броўка**,*

*народныя мастакі рэспублікі **Заір Азгур, Андрэй Бембель, Яўген Зайцаў**,*

*пісьменнікі **Генадзь Бураўкін, Уладзімір Караткевіч, Аркадзь Маўзон, Еўдакія Лось**,*

*кампазітары **Анатоль Багатыроў, Іван Дзяржынскі, Уладзімір Сарокін, Марк Фрадкін**».*

**Артыкул «Госці Віцебска – дзеячы культуры».**
Віцебскі рабочы. – *1972 г. – 4 ліпеня.*



**Дзеячы культуры ў Віцебску (злева направа): Заір Азгур, Марк Фрадкін, Пятрусь Броўка, Андрэй Бембель, Генадзь Бураўкін.**

***1 ліпеня 1972 г.***

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.2260. Воп.6. Спр.59. Арк.21



**Каля помніка М.Ф.Шмырову ў Віцебску.** ***1 ліпеня 1972 г.***

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.2260. Воп.6. Спр.59. Арк.17



**У віцебскай студыі тэлебачання.** ***1 ліпеня 1972 г.***

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.2260. Воп.6. Спр.59. Арк.2



**Дзеячы культуры ў Віцебску (злева направа): Заір Азгур, Пятрусь Броўка, Андрэй Бембель, Генадзь Бураўкін.**

***1 ліпеня 1972 г.***

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці.
Ф.2260. Воп.6. Спр.59. Арк.10



**Пятрусь Броўка**
**вядзе размову**
**з Уладзімірам**
**Караткевічам.**

**Віцебск,**
**на Заходняй Дзвіне.**

***1 ліпеня 1972 г.***

Дзяржаўны архіў
Віцебскай вобласці.
Ф.2260. Воп.6. Спр.59.
Арк.24

# Частка 3.
# Вершы



Ні для сяброў,
Ні для каханкаў,
Яна ж у думках увесь час —
Няма ні станцый, ні паўстанкаў,
Такіх, каб раз'ядналі нас.

Калі імкнемся
Да сустрэчы,
Не скажаш думкам: то - маўчы,
А ці то ўранні, ці то ўвечар,
А ці ўсярэдзіне начы.

Іх пераканюць бляскам зоры,
А ці нашэпчуць іх вятры,
Не перапыняць думак горы,
Ані пустыні, ні моры.

Сакавік, 1973 г.

Пятрусь Броўка



З кн

Палі, лугі, гаі, разлогі,
Бор над Бярозаю-ракой —
Ах, колькі бачыла дарога,
Сягоння крочу па якой.

Іду па цянях продкаў наскіх,
Свой цень за імі ўдаль вяду,
Іду я па легендах, казках,
Па песнях вечнасці іду.

Іду, нібы ўзлятаю ў неба,
Ды азіраюся назад —
Ці ўсё я ўзяў ад іх, што трэба,
А можа сам чаго не варт?

Ды марай цешуся такою,
Што супакойвае мяне,
Што нехта пойдзе ўслед за мною
І можа добра памяне?

Май, 1973 г.

Пятрусь Броўка

**Вершы П.Броўкі. Рукапіс. *Сакавік – май 1973 г.***

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.2260. Воп.9. Спр.44. Арк.25, 26


27

Калі табе бывае сумна…

Калі табе бывае сумна, дык ты не падай у адчай,
Ты паглядзі, які вясёлы паміж узгоркамі ручай —
Усё раскрыта, што ён мае, уся краса відно да дна,
А ты паслухай, ты паслухай, а што за срэбра-гамана!

Калі табе бывае сумна, дык ты не вешай галавы,
Ты паглядзі на сенажаці, на колер кветак і травы,
А, што за кветкі, што за кветкі, у кожнай свой адменны твар,
А, што за пах, калі адчуеш — у сэрцы ўзнімецца пажар!

Калі табе бывае сумна, не выціскай пакутных слёз,
А ты прыгледзься, ты прыгледзься да стану тоненькіх бяроз —
Плывуць у свет, што ні галіна, дык па зялёнаму вяслу,
І кожны ліст ціха спявае шчырую падзяку і хвалу!

Ліпень, 1973 г.

Пятрусь Броўка

**Верш П.Броўкі**
**«Калі табе бывае сумна…»**
**Рукапіс.**

***Ліпень 1973 г.***

Дзяржаўны архіў
Віцебскай вобласці.
Ф.2260. Воп.5. Спр.145. Арк.5


10

Бровка Пятрусь

Цы мын у зынаргъдæр...
(Што мне мілей...)

Хатт хъарм, ахæмигъ бонæй цауддæр
На вайы æгæст бон, зæгъынц.
Хæстон нæмгуытæй мын-зынаргъдæр
Хъæдуры æгъудтæ вайынц.

Нынæры танчы хъæрæхст тракторыл,
Тындзы фæдис уадæй кæндæр.
Мæнæн зынаргъдæр вайы трактор
Куы фæфæлдахы уæлдзæг мæр.

Ракетæ дунетыл æрзилы,
фæзæвары бæрзæндтыл йæ уд.
Мæнæн æфтауы цин мæ цинæн
Сабыр ракетæты салют.

фæлæ фæд хæсты уæд куы сыстад,
фæдыбæстæйы сæр куы хъуыд,
Мæнæн уæд цы нæмыг нæлхъуытæй
Садæ хатты зынаргъдæр уыд.

1961

Пухаты Ал. тæлмац
(Перевод Александра Пухаева)

**Вершы П.Броўкі**
**на асецінскай мове.**
***Пераклад***
***Аляксандра Пухаева.***

Дзяржаўны архіў
Віцебскай вобласці.
Ф.528. Воп.2. Спр.8.
Арк.10, 11


11

Бровка Пятрусь

Фæдтæ
(Следы)

Дунейыл рæгъзамантæй ардæм
У махæй алкæмæндæр фæтк.
Удгоймаг уæ, æртах, – нæ царды
Ныууадзынц алы рæн сæ фæд.

Йæ зардæй цъиу йæ фæд ныууадзы,
Сæрддон бон – райсомы æртах.
Дæ фæстæ, адæймаг, хъуыддæджы,
Ды уæс фæдтæ ныууадзыс, зæгъ!

Дæ зонд, дæ къухæ зæххыл фæдисы.
Æппæт диссаг, фæзынд уæд
Поэты фæд уæ, трактористы,
Конструктор, арæзгæнæг фæд.

Уæхимæ дуг æппæт æлвасы,
Æппæт фæцивæсыл-йæ куыст.
Ысхæдры кæрды фæст бæласыл,
Гъе, дуртыл ахорæны фæст.

Сымах, нæ фæзивæд, æрмæстдæр
Уæрæх фæндæгтыл дард цæут.
Цы фæдтæ бæззайынц уæ фæстæ,
Гъе, уыдон мæ фæрох кæнут.

1963

Пухаты Алыксандры тæлмац
(Перевод Александра Пухаева

# Частка 4.
# Віцебску прысвячаецца






Пятрусь БРОЎКА,

народны паэт Беларусі,
лаўрэат Ленінскай прэміі,
Герой Сацыялістычнай Працы.

## ТЫСЯЧАГАДОВАМУ ВІЦЕБСКУ

Віцебск,
Горад над Дзвіною,
Ты, вядомейшы здавён,
Ты узняўся галавою
І цэлы свет відзён.

Жыць табе
І красавацца,
Ты прайшоў
вялікі шлях —
І славуты ордэн Працы
На тваіх гарыць грудзях.

Ты, герой
У днях суровых,
Слаўны працай і мастак,
Мудры, тысячагадовы
І бадзёры, як юнак!

**Верш П.Броўкі «Тысячагадоваму Віцебску».**
Спецвыпуск газеты «Віцебскі рабочы». – *1974 г. – 30 жніўня.*
Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.2260. Воп.9. Спр.44. Арк.1



**П.У.Броўка.**

Дзяржаўны архіў
Віцебскай вобласці.
Ф.3486. Воп.5. Спр.13. Арк.9



ВИТЕБСКУ – СЛАВА!

Слова П.БРОВКИ
Музыка Г.ЮДИНА

1.

Сэрцам шчырым і гарачым
Мы пяём табе любоў, –
Віцебск, ты пражыў, пабачыў
Шмат за тысячу гадоў.

2.

Віцебск, слава баявая
На шаўках тваіх сцягоў.
Помнім бацьку мы Міная
І лясных яго арлоў.

ПРИПЕВ: Біўся за волю ты, заўжды як герой,
і ніколі і ніколі не схіляўся галавой!

3.

Горад родны, сёння кожны
Горды працаю тваёй.
Ты і дужы і прыгожы
Па-над Віцьбой і Дзвіной!

ПРИПЕВ: Біўся за волю ты, заўжды як герой,
і ніколі і ніколі не схіляўся галавой!

**«Віцебску – Слава!»**
**Словы П.Броўкі,**
**музыка Г.Юдзіна.**

Дзяржаўны архіў
Віцебскай вобласці.
Ф.2260. Воп.5. Спр.145. Арк.5




**«Віцебску – Слава!» Словы П.Броўкі, музыка Г.Юдзіна.**

Дзяржаўны архіў  Віцебскай вобласці. Ф.2260. Воп.5. Спр.145. Арк.5–6адв.

ВИТЕБСКУ

1.

Сэрцам шчырым і гарачым
Мы пяём табе любоў, -
Віцебск, ты пражыў, пабачыў
Шмат за тысячу гадоў.

ПРИПЕВ: Біўся за волю
і ніколі і

3.

Горад родны, сёння кожны
Горды працаю тваёй.
Ты і дужы і прыгожы
Па-над Віцьбой і Дзвіной!

ПРИПЕВ: Біўся за вол
і ніколі і

ВИТЕБСКУ — СЛАВА !

Слова П.БРОВКИ. МУЗЫКА Г.ЮДИНА.

I. Каждым сердцем, песней светлой
Мы любовь тебе несём,
Витебск наш тысячелетний,
Ты в цветеньи молодом.
ПРИПЕВ: Сражался за счастье
Ты всегда, как герой.
И вовеки не погаснет
Добрый свет твой над землёй.

2. Витебск—слава боевая
На шелках твоих стягов.
Помним храброго Миная
И лесных его орлов.
ПРИПЕВ.

3. Мы твоей гордимся силой,
Твоей славой трудовой,
Город древний и красивый
Над широкою Двиной.
ПРИПЕВ: Сражался за счастье
Ты всегда, как герой.
И вовеки не погаснет
Добрый свет твой над землёй.

ПЕРЕВЁЛ С БЕЛОРУССКОГО Д.СИМАНОВИЧ.

**«Витебску – Слава!»**
**Словы П.Броўкі,**
**музыка Г.Юдзіна.**
***Пераклад Давіда Сімановіча*.**

Дзяржаўны архіў
Віцебскай вобласці.
Ф.2260. Воп.5. Спр.145. Арк.7



31

Заўсёды радуюся поспехам маіх дарагіх землякоў - віцеблян. Жадаю, каб з кожным днём Вашы дасягненні раслі і памнажаліся.

Шчыра ўдзячны і за вялікую ўвагу да маёй творчасці, а гэта дае добры настрой для працы наперадзе.

П. Пятрусь Броўка

Чэрвень, 1975 г.

*«Заўсёды радуюся поспехам маіх дарагіх землякоў – віцеблян. Жадаю, каб з кожным днём Вашы дасягненні раслі і памнажаліся.*

*Шчыра ўдзячны і за вялікую ўвагу да маёй творчасці, а гэта дае добры настрой для працы наперадзе».*

*Пятрусь Броўка*

**Ліст П.У.Броўкі да землякоў. Рукапіс. *Чэрвень 1975 г.***

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.2260. Воп.9. Спр.44. Арк.31

# Частка 5.
# Памяць

**ВИТЕБСКИЙ ГОРОДСКОЙ СОВЕТ НАРОДНЫХ ДЕПУТАТОВ**
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**РЕШЕНИЕ**

От 25.12.80 г. № 519
г. Витебск

О переименовании улицы.

Во исполнение постановления Совета Министров БССР от 10 июля 1980 года №256 и в целях увековечения памяти выдающегося советского поэта и общественного деятеля Петра Устиновича Бровки, исполнительный комитет Витебского городского Совета народных депутатов

решил:

1. Переименовать улицу Промышленную в улицу имени Бровки П.У.

2. Поручить отделу коммунального хозяйства горисполкома (тов. Сидоренко Л.М.) до 1 июля 1981 года изготовить и установить мемориальную доску.

3. Контроль за выполнением настоящего решения возложить на архитектурно-планировочное управление горисполкома (тов. Щерба А.Г.).

Председатель исполкома В.П.Воробьева

Секретарь исполкома В.С.Кулагина

84—2000.



**П.У.Броўка.**
Дзяржаўны архіў
Віцебскай вобласці.
Ф.2260. Воп.6. Спр.163. Арк.2

**Рашэнне Віцебскага гарвыканкама**
**аб перайменаванні вуліцы Прамысловай**
**у вуліцу імя П.Броўкі.**
***25 снежня 1980 г.***
Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці.
Ф.322. Воп.12. Спр.486. Арк.6



# СВЯТА НА ВУЛІЦЫ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ

На вуліцы, якая носіць імя нашага земляка народнага паэта Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР і БССР Петруся Усцінавіча Броўкі, адбылося свята: ва ўрачыстай абстаноўцы адкрыт памятны знак з барэльефам песняра. Аблічча вялікага майстра паэтычнага слова ўвасобіў у бронзе скульптар Мікалай Кандрацьеў.

Пятрусь Броўка быў паэтам-грамадзянінам, інтэрнацыяналістам. Доўга давялося б пералічваць назвы кніг вершаў і прозы, публіцыстыкі, якія ён напісаў. А дадайце да гэтага дванаццаць тамоў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, ля вытокаў стварэння якой стаяў наш славуты зямляк, яго актыўную грамадскую дзейнасць...

Пятрусь Усцінавіч любіў наш горад, і горад заплаціў яму сваёй любоўю.

Пра гэта гаварылі на адкрыцці памятнага знака першы намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкома В. К. Лапінскі, пісьменнік з Мінска Мікалай Чаргінец, паэт Давід Сімановіч, сакратар абласнога аддзялення СП БССР паэт Алег Салтук.

На адкрыцці памятнага знака на вуліцы Петруся Броўкі былі сакратар абкома КП Беларусі І. А. Навумчык і першы сакратар Віцебскага гаркома КПБ А. І. Образаў.

І. ЗІМІН.

Фота Г. ЖУКАВА.

**Артыкул «Свята на вуліцы Петруся Броўкі».**
Віцебскі рабочы. – *1989 г. – 1 ліпеня.*

*«На вуліцы, якая носіць імя нашага земляка народнага паэта Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР і БССР Петруся Усцінавіча Броўкі, адбылося свята: ва ўрачыстай абстаноўцы адкрыт памятны знак з барэльефам песняра. Аблічча вялікага майстра паэтычнага слова ўвасобіў у бронзе скульптар Мікалай Кандрацьеў.*

***Пятрусь Усцінавіч любіў наш горад, і горад заплаціў яму сваёй любоўю*».**




**Вокладка музычнай пласцінкі з вершамі П.Броўкі.**
Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.2260. Воп.9. Спр.44. Арк.39




**Памятны знак у пачатку вуліцы імя Петруся Броўкі.**
***Віцебск, 2025 г.***

**Верш П.Броўкі «І нехта ўспомніць пра мяне»…**

Броўка П. Калі ласка. Вершы / П.Броўка – Мінск: Беларусь, 1972. – 280 с. Бібліятэчны фонд Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.

**І нехта ўспомніць пра мяне**

*Я ведаю, час прыйдзе гэткі —*
*Усё прачнецца пры вясне,*
*Як матылі, успыхнуць кветкі...*
*І нехта ўспомніць пра мяне.*

*Аднойчы ўдзень, а можа ўранку,*
*Сыдуцца хмары чарадой,*
*Між чорных хмар бліснe маланка...*
*І нехта ўспомніць воблік мой.*

*Бяседа прыйдзе, ды якая,*
*Яна за сэрцы ўсіх кране,*
*Да столі кубкі паўздымаюць...*
*І нехта ўспомніць пра мяне.*

*Абдымуцца сябрынай цеснай,*
*Дзе кожны родны, кожны свой,*
*Аж закалоціць сцены песня...*
*І нехта ўспомніць воблік мой.*

*Усё чаргуецца з часамі.*
*Час прыйдзе вершу палымнець,*
*Радкі пальюцца за радкамі...*
*І нехта ўспомніць пра мяне.*



*І прыйдзе шчыры і спакусны*
*Той міг, калі ў цішы начной*
*Замруць у пацалунку вусны...*
*І нехта ўспомніць воблік мой.*

*І згубяць лік усім гадзінам,*
*Бо ўсіх шчаслівых не міне*
*Час непаўторны і адзіны...*
*І нехта ўспомніць пра мяне.*

*А ўранку зноў клапоты, справы,—*
*У кожнага кірунак свой*
*У тым шляху цяжкім, цікавым...*
*І нехта ўспомніць воблік мой.*

*1968 г.*

УЧРЕЖДЕНИЕ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ АРХИВ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ БИБЛИОТЕКА Калинина, 22

Віцебск, 2025